Газета дзяржаўнай установы адукацыі
“Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



№3
Лістапад, 2021

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:

Аздараўленчы лагер "Лістападзікі". стар. 2

Фестываль Робатаў стар. 3

Здаровы лад жыцця стар. 4

Майстар сваёй справы стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6



# Аздараўленчы лагер “Лістападзікі”

Падчас восеньскіх канікулаў у нашай ўстанове працаваў аздараўленчы лагер з дзённым знаходжаннем вучняў “Лістападзікі”, дзе свой вольны час цікава і весела праводзілі 15 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Насычаная і разнастайная праграма аздараўленчага лагера не дазваляла вучням сумаваць. Для іх былі арганізаваны тэматычныя прагулкі, віктарыны, конкурсы, забавы на свежым паветры інш. Акрамя таго, у лагеры вялікая ўвага надавалася асновам бяспекі жыццядзейнасці. Школьныя канікулы ў рабят, якія наведвалі аздараўленчы лагер “Лістападзікі”, атрымаліся яркімі, цікавымі і насычанымі.









# Фестываль Робатаў

Надзвычай цікавым выдалася наведванне навучэнцамі музея новага пакалення "Фестываль Робатаў" у Мінску. Тут можна было пазнаёміцца з 85 робатамі з усяго свету. Гэта апошнія  мадэлі з выстаў у Лас-Вегасе, Пекіне, Берліне, Мілане і Токіа. З Кожны жадаючы мог з робатамі патанцаваць, спець, пагутарыць, прыручыць робажывёл.













# Здаровы лад жыцця

18 лістапада (трэці чацвер месяца) – Міжнародны дзень адказа ад курэння, які адзначаецца штогод з 1977 года. Тытуневы дым утрымлівае у сваім саставе вялікую колькасць шкодных рэчываў. Тытуневыя адходы - гэта 7000 таксічных хімічных рэчываў, якія атручваюць навакольнае асяроддзе.

Кінуць курыць у сілах кожнага курыльшчыка, трэба толькі захацель. Але лепш і не пачынаць. Таму ў нашай установе прайшлі шматлікія мерапрыемствы, прысвечаныя Сусветнаму дню адказу ад курэння “Падары сабе чыстыя легкія”.







# Майстар сваёй справы

Адным з самых цікавых мерапрыемстаў у шосты школьны дзень  стала сустрэча “Майстар сваёй справы”. На гэта мерапрыества была запрошана Сакалоўская Таццяна Аляксандраўна. Яна на працягу некалькі гадоў займаецца вырабам мыла, а таксама аксэсуараў для прычосак, дэкаратыўных свяцільнікаў. Таццяна Аляксандраўна правяла майстар-клас па вырабу сахарнага скрабу “Мандарынка”. Дзеці не толькі з захапленнем слухалі і глядзелі на працесс вырабу. Кожны жадаючы  сам зрабіў сабе скраб у выглядзе “Мандарынкі .









# *Весткі з дзіцячага сада*

Месяц лістапад выдаўся таксама багатым на падзеі. Мы разам малявалі любімы Дзяржынск, былі вяселымі выратавальнікамі, вучыліся бяспечным паводзінам, ратавалі дрэва.







